# АДЛЮСТРАВАННЕ ВАЖНЕЙШЫХ АСПЕКТАЎ ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст. У ПРАЦАХ РАСІЙСКІХ ГІСТОРЫКАЎ XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

**Л. В. Мікалаева**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», г. Мінск*

**Аннотация:** В статье дан анализ основных произведений российских историков XVIII – начала XX в., в которых были отражены важнейшие аспекты истории внешней политики Великого Княжества Литовского в конце XIV – первой половине XVI в. Сделан вывод о том, что в дореволюционной российской исторической литературе в трудах исследователей XVIII в. внешнеполитическая история Великого Княжества Литовского была представлена в общем контексте развития истории России. В XIX в. уже обозначилась тенденция к монографическому изучению разных сторон внешней политики и дипломатии Великого Княжества Литовского. Однако объектом специального исследования данные вопросы так и не стали. Российские историки демонстрировали самый широкий диапазон мнений по рассматриваемой проблематике, затрагивая в научных исследованиях разнообразные ее стороны. Подготовленный ими задел стал базой для продолжения исследований в последующий период.

**Ключевые слова:** историография; внешняя политика; дипломатия; Великое Княжество Литовское.

**Анатацыя:** У артыкуле дадзены аналіз асноўных твораў расійскіх гісторыкаў XVIII – пачатку XX ст., у якіх былі адлюстраваны важнейшыя аспекты гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – першай палове XVI ст. Зроблена выснова аб тым, што ў дарэвалюцыйнай расійскай гістарычнай літаратуры ў працах даследчыкаў XVIII ст. знешнепалітычная гісторыя Вялікага Княства Літоўскага была прадстаўлена ў агульным кантэксце развіцця гісторыі Расіі. У XIX ст. ужо абазначылася тэндэнцыя да манаграфічнага вывучэння розных аспектаў знешняй палітыкі і дыпламатыі Вялікага Княства Літоўскага. Аднак аб’ектам спецыяльнага даследавання дадзеныя пытанні так і не сталі. Расійскія гісторыкі дэманстравалі самы шырокі дыяпазон меркаванняў па разглядаемай праблематыцы, закранаючы ў навуковых даследаваннях разнастайныя яе бакі. Зроблены імі задзел стаў базай для працягу даследаванняў у наступны перыяд.

**Ключавыя словы:** гістарыяграфія; знешняя палітыка; дыпламатыя; Вялікае Княства Літоўскае.

У даследаваннях расійскіх гісторыкаў XVIII – пачатку XX ст. знайшлі адлюстраванне шматлікія аспекты, звязаныя з вывучэннем знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у канцы XIV – першай палове XVI ст. Сярод іх можна вылучыць: знешнепалітычныя інтарэсы ВКЛ і шляхі іх рэалізацыі; напрамкі развіцця міжнародных сувязей; фарміраванне дыпламатычнай службы; ідэалагічнае суправаджэнне знешнепалітычных акцый; дыпламатычны цырыманіял.

Розныя пытанні, звязаныя з праблематыкай і даледаваннем знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст., прыцягвалі ўвагу дарэвалюцыйных расійскіх гісторыкаў у першую чаргу ў кантэксце супрацьстаяння паміж ВКЛ з яго ўсходнім суседам, Маскоўскім Вялікім Княствам, якое ў разглядаемы перыяд паступова ператварылася з невялікай дзяржавы Паўночна-Усходняй Русі ў магутнае Рускае царства. Пытанні знешняй палітыкі ВКЛ разглядаліся даследчыкамі XVIII ст. у агульным кантэксце гісторыі Расіі.

Традыцыйна ў Расіі пачатак новага этапа пераўтварэння гістарычных ведаў у навуку прынята звязваць з імем В. М. Тацішчава. Яго праца «История Российская» [25] з'яўлялася адным з найважнейшых твораў рускай гістарыяграфіі другой чвэрці XVIII ст., азнаменаваўшы пачатак перахода ад сярэднявечнага летапісання да крытычнага стылю апавядання. В. М. Тацішчаў не проста капіраваў і перапісваў інфармацыю з даступных яму крыніц, але спрабаваў яе крытычна пераасэнсаваць. З-за таго, што многія выкарыстаныя ім крыніцы не дайшлі да наступных пакаленняў даследчыкаў, ужо ў XIX ст. узнікла дыскусія наконт сапраўднасці так званых «тацішчаўскіх паведамленняў». Яна працягваецца і ў нашы дні. Аднак, незалежна ад пунктаў гледжання, большасць аўтараў разглядаюць сачыненне В. М. Тацішчава як важны гістарычны твор. У сваім даследаванні ён аддаваў перавагу палітычнай гісторыі Расійскай дзяржавы, звяртаючы ўвагу і на яе ўзаемаадносіны з бліжэйшымі суседзямі. У перыяд Вялікага Княства Маскоўскага адным з важнейшых яго палітычных контрагентаў і канкурэнтаў было ВКЛ. Але, па сутнасці, усе спробы В. М. Тацішчава усталяваць прычынна-выніковыя сувязі падзей зводзіліся да апісання гістарычных асоб, часцей за ўсё князёў і цароў, што прадвызначыла стаўленне да знешняй палітыкі дзяржавы як да характарыстыкі іх волі. Такі погляд на ход гісторыі быў характэрным у цэлым для еўрапейскай гістарычнай навукі таго часу. Нягледзячы на пэўны схематызм у падачы інфармацыі, праца В. М. Тацішчава аказала ўплыў на погляды наступных пакаленняў расійскіх гісторыкаў, у тым ліку і пры адлюстраванні пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст.

З гісторыкаў XVIII ст. больш поўна пытанні знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст. асвятляліся ў працы М. М. Шчарбатава «История российская от древнейших времен» [29]. Пры яе напісанні гісторык выкарыстаў разнастайныя крыніцы, якія адрозніваў па ступені дакладнасці: летапісы, пасольскія кнігі, запіскі іншаземцаў. Пры гэтым, як і

В. М. Тацішчаў, выкладанне матэрыялаў ён вёў па летапіснай храналагічнай схеме. Аднак у сваім даследаванні М. М. Шчарбатаў ужо выкарыстоваў і архіўныя крыніцы. Акрамя таго, ён больш правільна абыходзіўся з паведамленнямі летапісаў, не зліваючы звесткі розных летапісных спісаў у адзін тэкст і адрозніваючы свой тэкст ад тэксту крыніц, на якія даваў дакладныя спасылкі.

XIX ст. займала пачэснае месца ў працэсе станаўлення гістарычнай навукі. Для праблем вывучэння разнастайных аспектаў знешняй палітыкі ВКЛ гэтае стагоддзе мела важнае значэнне, паколькі менавіта на працягу яго пачалі з'яўляцца першыя сур'ёзныя даследаванні, заснаваныя на багатым комплексе апавядальных і дакументальных крыніц. XIX ст. стала сапраўдным пачаткам развіцця літуаністыкі як навуковага кірунку гістарычных даследаванняў. Пры гэтым частка прац, што пабачылі свет у XIX ст., не толькі стала класікай літуаністыкі, але не страціла свайго навуковага значэння і ў наш час.

Да ліку заслуг расійскіх гісторыкаў канца XVIII – першай паловы XIX ст. можна аднесці выяўленне і ўключэнне ў навуковы зварот асноўнай часткі крыніц па гісторыі ўзаемаадносін ВКЛ са сваімі суседзямі і некаторымі іншымі краінамі за перыяд канца XIV – сярэдзіны XVI ст. Дзякуючы намаганням М. М. Бантыш-Каменскага, які з 1762 г. пачаў працаваць, а з 1800 г. узначаліў Маскоўскі архіў Калегіі замежных спраў, яшчэ ў 1780–1784 гг. быў падрыхтаваны агляд пасольскіх кніг, у якіх быў зафіксаваны матэрыял па дыпламатычных стасунках Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ і Польшчай у 1487–1584 гг. Ён быў надрукаваны толькі ў 1860-х гг. [2].

Напрацоўкі М. М. Бантыш-Каменскага пазней былі выкарыстаны М. М. Карамзіным пры стварэнні адной з першых абагульняючых прац па гісторыі Расіі – 12-томнай «Истории государства Российского», напісанай на аснове шырокай базы крыніц [13]. У V–VIII тамах гэтай працы М. М. Карамзін некалькі раздзелаў прысвяціў міжнародным кантактам Маскоўскай дзяржавы ў эпоху праўлення Дзмітрыя Данскога, Васіля II, Івана III і Васіля III, у тым ліку ўзаемаадносінам з ВКЛ. Пэўнае месца ў даследаванні займалі развагі аб прыродна-геаграфічным становішчы Вялікага Княства Маскоўскага – фактары, які садзейнічаў устанаўленню дыпламатычных адносін з аддаленымі ад яго дзяржавамі (напрыклад, са Свяшчэннай Рымскай імперыяй). Прызнанне ролі прыродна-геаграфічнага фактара ў гісторыі знешняй палітыкі дзяржаў стала новай з'явай у тагачаснай гістарыяграфіі. Праца М. М. Карамзіна засноўвалася на шырокай базе крыніц, якая ўключала як летапісны матэрыял, так і пасольскую дакументацыю. Каштоўнасць твору дадавалі каментарыі аўтара, у якіх утрымліваліся выпіскі з выкарыстаных ім рукапісаў (частка з іх страчана). Такім чынам, менавіта яму ўдалося апублікаваць іх упершыню і захаваць для нашчадкаў.

Трэба адзначыць, што першапачатковая гісторыя ВКЛ даследчыкам успрымалася як расійская і праваслаўная. Аднак пасля прыняцця Ягайлам польскай кароны і каталіцтва ВКЛ ацэньвалася М. М. Карамзіным ужо як варожая да Расіі дзяржава [13, т. V, с. 55]. Такім чынам, змена вялікім князем літоўскім канфесійнай прыналежнасці і прыняцце польскай кароны непасрэдна паўплывалі на ацэнкі гісторыкам узаемаадносін паміж Вялікім Княствам Маскоўскім і ВКЛ, якія разглядаліся выключна з пункту гледжання інтарэсаў Масквы, як прэтэндэнта на ўз’яднанне рускіх зямель. І хаця ў М. М. Карамзіна адсутнічала тое выпячванне рэлігійнага фактару, якое пазней праявілася ў кансерватыўнай расійскай гістарыяграфіі XIX – пачатку XX ст., вылучэнне канфесійных аспектаў узаемаадносін паміж дзяржавамі стала важным момантам у аповядзе гісторыка.

У залежнасці ад узмацнення супрацьборства Вялікага Княства Маскоўскага і ВКЛ у апісанні М. М. Карамзіна павялічвалася і значэнне канфесійнага фактару. У прыватнасці, ён сур’ёзна ўспрымаў заявы вялікага князя маскоўскага Івана III пра рэлігійныя матывы пачатку вайны з ВКЛ у 1500 г., сцвярджаючы, што «…война едва ли могла бы открыться между ними, если бы в распрю их не вмешалась вера… Иоанн долго сносил грубости зятя; но терпение его исчезло, когда надлежало защитить православие от латинских фанатиков» [13, т. VI, с. 181]. Відавочна, што гісторык сам верыў у існаванне ў ВКЛ таго часу праследу праваслаўя, бо дастаткова красамоўна і эмацыйна заяўляў, што «уведомили великого князя, что в Литве открылось гонение на восточную церковь» [13, т. VI, с. 181], «между тем гонение на греческую веру в Литве продолжалось» [13, т. VI, с. 182]. Характэрна, што, пішучы пра азначаныя ганенні на праваслаўных у ВКЛ, даследчык так і не прывёў канкрэтных іх прыкладаў, распавядаючы толькі пра прапаганду уніяцкіх ідэй у рэчышчы рашэнняў Фларэнтыйскага сабора. Пераходы праваслаўных памежных князёў на службу да Івана III ён разглядаў менавіта як праяву рэакцыі на існаваўшыя ганенні, сцвярджаючы, што «ревностные в православии христиане гнушались латинским соблазном и многие выехали в Россию» [13, т. VI, с. 182].

Выкарыстанне Іванам III канфесійнага фактару ў якасці інструмента ціску на заходняга суседа выразна праілюстаравана ў працы на прыкладзе абставін шлюбу вялікага князя літоўскага Аляксандра з дачкой маскоўскага ўладара Аленай, адной з умоваў якога было захаванне маскоўскай князёўнай праваслаўнага веравызнання пасля вяселля [13, т. VI, с. 155]. Такім чынам, гісторык у многім паўтарыў словы рускіх публіцыстаў XVI ст. у інтэрпрэтацыі канфлікту паміж Вялікім Княствам Маскоўскім і ВКЛ у канцы XV – сярэдзіне XVI ст. як праліцця нявіннай хрысціянскай крыві, але толькі з аднаго боку, маскоўскага. Носьбіты ж каталіцкага веравызнання ставіліся гісторыкам па сутнасці на адну прыступку з мусульманамі, ці язычнікамі, змаганне з якімі набывала рысы абароны святой веры Хрыста. У цэлым жа супрацьстаянне, якое разгарнулася паміж Вялікім Княствам Маскоўскім і ВКЛ, у М. М. Карамзіна прадстаўлена як літоўская экспансія

на заходнерускія землі, з аднаго боку, і збіранне рускіх зямель Маскоўскім Вялікім Княствам, – з другога.

Скрозь прызму гісторыі расійскай дыпламатыі ўзаемаадносіны ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім былі разгледжаны ў даследаванні С. Дабраклонскага [8]. У ім утрымліваўся агляд міжнародных сувязей маскоўскіх і расійскіх правіцеляў ад часоў вялікага князя Івана III да кіравання імператара Аляксандра I. На думку гісторыка, галоўнымі перашкодамі на шляху развіцця знешнепалітычных кантактаў Вялікага Княства Маскоўскага з замежнымі дзяржавамі да апошняй чвэрці XV ст. сталі феадальная раздробленасць рускіх зямель і мангола-татарскае ярмо. Пэўнае значэнне даследчык надаваў барацьбе ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім за землі былой Кіеўскай Русі. С. Дабраклонскі сфармуляваў тэзіс, які атрымаў далейшае развіццё ў савецкай і сучаснай расійскай гістарыяграфіі, пра супрацьстаянне з ВКЛ як своеасаблівы рухаючы фактар развіцця маскоўскай дыпламатыі, які садзейнічаў усталяванню сувязей з іншымі замежнымі правіцелямі [8, с. 43].

Канцэптуальныя асновы гістарычных поглядаў М. М. Карамзіна былі замацаваны ў шэрагу прац расійскага афіцыйнага гістарыёграфа 30-х гг. XIX ст. М. Г. Устралава. Падобныя ж погляды можна было знайсці і ў блізкага да славінафільскай гістарыясофіі ідэолага панславізму М. П. Пагодзіна. У артыкуле М. Г. Устралава «Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать Великое княжество Литовское» прама казалася, што ВКЛ было «русское, и вера, и язык, и гражданские уставы; сами князья литовские, рожденные от русских княгинь, женатые на русских княгинях, крешенные в православную веру, казались современникам потомками Владимира Святого» [27, с. 17]. Аднак больш выразна пазіцыя М. Г. Устралава па разглядаемай праблеме была выказана ў яго працы «Русская история», у якой некалькі глаў былі прысвечаныя гісторыі ВКЛ [28]. Яго адносіны да ВКЛ у разглядаемым творы змяняліся у залежнасці ад таго, якое становішча ў гэтай дзяржаве займала праваслаўе. Так, да часу кіравання Ягайлы ў тэксце можна адзначыць выразную сімпатыю аўтара да ВКЛ, але толькі таму, што ён лічыў, што ў першапачатковы перыяд існавання праваслаўе было тут пануючай рэлігіяй [28, с. 162]. Пераход Ягайлы ў каталіцтва М. Г. Устралаў лічыў здрадай праваслаўнай веры і звязваў экспансію каталіцтва ў ВКЛ з падтрымкай гэтага манарха. Між тым вялікі князь Вітаўт, таксама католік, ацэньваўся аўтарам як вялікі палітык, які быў абыякавы да вераспавядання і падтрымліваў раўнапраўе. Яго імкненне да стварэння асобнай ад Масквы Кіеўскай мітраполіі, што і было рэалізавана, М. Г. Устралаў разглядаў толькі як імкненне мець свой асобны духоўны цэнтр. У адрозненне ад М. М. Карамзіна, М. Г. Устралаў лічыў, што пераемнікі Ягайлы не вялі ганенняў супраць праваслаўнага насельніцтва і да канца XVI ст. у ВКЛ праяўлялася верацярпімасць, а праваслаўе іграла тут галоўную ролю [28, с. 262]. Але услед за М. М. Карамзіным ён лічыў злучанае з Польшчай уніяй

ВКЛ галоўным ворагам Вялікага Княства Маскоўскага (пазней – Рускага царства). Маскоўска-літоўскія войны ў яго інтэрпрэтацыі таксама мелі характар войн рэлігійных.

Галоўным прадстаўніком гістарыцызму ў Расіі з'яўляўся С. М. Салаўёў, аўтар працы «История России с древнейших времен» у 29 тамах. Пытанні знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – першай паловы XVI ст. былі адлюстраваны ў 4, 5 і 6 тамах [24]. С. М. Салаўёў упершыню загаварыў аб заканамернасцях гістарычнага працэсу і пачаў разглядаць знешнюю палітыку ВКЛ і Вялікага Княства Маскоўскага канца XIV – сярэдзіны XVI ст. у сувязі з унутрыпалітычнымі працэсамі. Там, дзе М. М. Карамзін бачыў сутыкненне характараў ваюючых уладароў – Казіміра, Аляксандра, потым і Жыгімонта – з аднаго боку, і Івана III, Васіля III – з другога, С. М. Салаўёў угледзеў глыбокую розніцу ў дзяржаўнай будове Вялікага Княства Маскоўскага і ВКЛ, якая тлумачыла ваенную перавагу першага.

С. М. Салаўёў праблему маскоўска-літоўскіх узаемаадносін у асноўным прадставіў у там жа ракурсе, што і М. М. Карамзін. І гэта нягледзячы на тое, што на аснове пазітывіскіх тэарэтыка-метадалагічных падыходаў С. М. Салаўёў па сутнасці выказаў новы погляд на гісторыю Расіі і на сусветна-гістарычны працэс у цэлым. Тлумачылася гэта тым, што для яго гістарыясофскай канцэпцыі быў уласцівы поглад на існаванне антаганістычных гістарычных місій у Расіі і Польшчы, паяднаўшыся з якой у рамках дзяржаўнага саюза ВКЛ таксама было асуджана на непазбежнае супрацьборства з Вялікім Княствам Маскоўскім (пазней – Рускім царствам). Пры гэтым С. М. Салаўёў прызнаваў важнасць Крэўскай уніі не толькі для польска-літоўскіх міждзяржаўных адносін, але і для ўсёй Усходняй Еўропы, засяродзіўшы ўвагу на яе наступствах: падрыве пазіцый Тэўтонскага ордэна і зменах у праваслаўных землях ВКЛ. Прычыны маскоўска-літоўскага суперніцтва бачыліся гісторыкам у барацьбе за заходнерускія землі ў рэлігійнай сферы. Гэты рэлігійная барацьба была паказана як частка сусветна-гістарычнага працэсу. С. М. Салаўёў упершыню загаварыў аб заканамернасцях апошняга.

Адным з вучняў С. М. Салаўёва быў В. В. Ключэўскі, які пакінуў прыкметны след в рускай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Сярод яго твораў для разглядаемай праблематыкі трэба выдзеліць «Курс русской истории» у 5 частках, які атрымаў шырокае прызнанне [15]. У гэтай абагульняючай працы В. В. Ключэўскі прадэманстраваў праблемнае выкладанне рускай гісторыі. Так, асобную лекцыю № 25 навуковец прысвяціў тэрытарыяльным набыткам вялікага князя маскоўскага Івана III і яго пераемнікаў, закрануўшы праблему ўзаемаадносін Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ. Пры гэтым вялікае значэнне ў трактоўцы прычын маскоўска-літоўскага суперніцтва надавалася канфесійнаму фактару. У тэксце гэтай лекцыі сцвярджалася, што «к концу XIV в. Литва и по составу населения, и по складу жизни представляла из себя больше русское, чем

литовское, княжество. Но в 1386 г. литовский великий князь Ягелло (Яков), воспитанный в православии своею матерью, рожденной княжной тверской Юлианией, женился на наследнице Польского королевства Ядвиге и принял католичество. Этот династический союз Литвы и Польши завязал роковой для соединенного государства религиозно-политический узел. С тех пор началась при содействии польско-литовского правительства католическая пропаганда в Западной Руси. Пропаганда эта особенно усилилась во второй половине XV в., когда Литвой правил сын Ягелло Казимир IV. Православное русское общество оказывало стойкое противодействие католическим миссионерам. В Западной Руси начиналось сильное брожение, ”замятия великая” между католиками и православными. ”Все наше православное христианство хотят окрестить, – писали оттуда, – за это наша Русь вельми ся с Литвою не любят”. Увлекаемые этим религиозным движением, и православные князья Западной Руси, еще не утратившие прежней самостоятельности в своих владениях под легкою властью великого князя литовского, начали один за другим приставать к Москве как к своему религиозному центру».

Такім чынам, каталіцкая экспансія, з аднаго боку, і прыцягненне адзінавернай праваслаўнай Масквы, з другога боку, паказаны В. В. Ключэўскім як складовыя элементы разгараўшагася супрацьстаяння паміж суседзямі, надаючы яму вобраз рэлігійнай барацьбы. Ён бачыў у ВКЛ непрымірымы канфлікт на канфесійнай глебе ўжо ў XV ст., пераносячы на гэты перыяд больш познія рэаліі канца XVI – першай паловы XVII ст. Пры гэтым, характарызуючы сітуацыю сярэдзіны XV ст., самым страшэнным ворагам Вялікага Княства Маскоўскага гісторык лічыў менавіта ВКЛ. І гэта нягледзячы на прызнанне існавання не самых лепшых яе стасункаў з Ардой. Таксама дастаткова павярхоўна і схематычна, падобна як і ў працах М. М. Карамзіна і С. М. Салаўёва, В. В. Ключэўскі адлюстраваў і стасункі ВКЛ з Малдаўскім Княствам, разгледзеўшы іх у асноўным скрозь прызму дынастычнай палітыкі.

У 1857 г. у Санкт-Пецярбургу выйшла праца І. В. Турчыновіча «Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен» [26], у якой знайшлі адлюстраванне і пытанні знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. Нягледзячы на тое, што шэраг крыніц гэтага твора былі ўпершыню выкарыстаны аўтарам, даследаванне І. В. Турчыновіча ў многім з’яўлялася кампілятыўным, складзеным на аснове прац М. М. Карамзіна і Т. Нарбута, і не мела высокай навуковай вартасці.

Дастаткова павярхоўна, скрозь прызму міжнародных кантактаў Маскоўскай дзяржавы, пытанні знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ былі асветлены ў лекцыях па рускай гісторыі С. Ф. Платонава [22].

Паўстанне 1863–1864 гг., яго падаўленае расійскімі ўладамі і з’явіўшыся пасля гэтага ўзмоцнены ўрадавы «заказ» на доказ таго, што ў мінулым тэрыторыя Заходняй Расіі (г. зн. былога ВКЛ) была краем «спрадвеку рускім» і праваслаўным і што розніцы паміж ёй і ўласна Расіяй

ніколі не было, у 1860–1890-х гг. выклікалі да жыцця цэлы шэраг публікацый расійскіх кансерватыўных гісторыкаў (М. В. Каяловіча [16; 17], П. М. Бацюшкова [3], П. Д. Бранцава [4; 5], Д. І. Ілавайскага [12]), якія з пастаўленай задачай справіліся. Галоўны ідэолаг гэтага заходнерускага кірунку – М. В. Каяловіч – лічыў, што на працягу ўсёй гісторыі «Заходняй Расіі» адбывалася барацьба двух пачаткаў – рускага (праваслаўнага) і польскага (каталіцкага). Па яго меркаванні, канчатковы падзел паміж Літвой і Руссю азнаменавала ўжо Гарадзельская ўнія 1413 г., пасля якой былі «литвины-латиняне поставлены в положение господ. Русские православные – в положение рабов…» [16, с. 161; 17, с. 132]. Гісторыі ВКЛ было прысвечана даследаванне П. Д. Бранцава, напісанае з пазіцый ідэалогіі заходнерусізму [4]. Гісторык зрабіў шэраг высноў, якія тлумачылі, чаму ВКЛ не ўдалося атрымаць перамогу ў барацьбе з Масквой за ўсходнеславянскія землі: па-першае, слабасць манархічнай улады [4, с. 300, 315]; па-другое, свавольствы і прывілеі польскіх паноў; па-трэцяе, пераслед праваслаўных [4, с. 294]. Для прац іншых прадстаўнікоў гэтага кірунку таксама быў уласцівы погляд на ВКЛ як на другі цэнтр збірання рускіх зямель, але толькі ў кантэксце разумення яго як рускай праваслаўнай дзяржавы.

Творы кансерватыўных гісторыкаў паўплывалі на гістарычныя даследаванні іншых навукоўцаў таго перыяду. Так, такі значны прадстаўнік кіеўскай гістарыяграфічнай школы, як У. Б. Антановіч [1, с. 231, 240–244], а таксама яго паслядоўнікі М. П. Дашкевіч [7, с. 152–154] і М. С. Грушэўскі пісалі пра існаванне ў ВКЛ «рускай партыі», якая ў XV–XVI стст. спрабавала супрацьстаяць уладам ВКЛ, нібыта адстойвала правы праваслаўных перад націскам каталіцызму. Праявы дзеяння гэтай «партыі» бачыліся, напрыклад, у замаху князёў на вялікага князя Казіміра ў 1481 г., у паўстанні М. Глінскага ў 1508 г. [6, с. 265–292].

Першай манаграфіяй па гісторыі руска-літоўскіх адносін у 1462–1508 гг. стала апублікаваная ў 1867 г. частка магістарскай дысертацыі Г. Ф. Карпава [14]. Праца значна саступала факталагічнай насычанасцю «Истории…» С. М. Салаўёва, не вызначалася глыбокім аналізам. Г. Ф. Карпаў не змог правільна ацаніць значэнне матэрыялаў «Метрыкі» ВКЛ для вывучэння дадзенага пытання, палічыўшы іх толькі нязначным дапаўненнем да маскоўскай пасольскай дакументацыі [14, с. IV]. Ён не выкарыстаў інфармацыю і польскіх хронік і, па сутнасці, толькі паўтарыў ужо вядомыя факты тагачаснай дыпламатычнай гісторыі. У хуткім часе дадзеная праца страціла сваё навуковае значэнне.

З 1890-х гг. расійскімі гісторыкамі пачалося сістэматычнае вывучэнне крыніц, меўшых дачыненне непасрэдна да гісторыі ВКЛ. У гэты час у навуковы зварот уводзіліся матэрыялы «Метрыкі» ВКЛ, а фундаментальныя працы М. К. Любаўскага [18; 20] і грунтоўныя даследаванні М. В. Доўнар-Запольскага [9; 10; 11], якія былі створаныя ў канцы XIX – пачатку XX ст., захавалі сваю значнасць і да нашых дзён.

Вялікую цікавасць для вывучаемай тэмы мае праца М. К. Любаўскага «Литовско-русский сейм», якая была прысвечана даследаванню гісторыі ўзнікнення, станаўлення і развіцця гэтага дзяржаўна-палітычнага інстытута, высвятленню яго функцый і прэрагатыў, а таксама ўплыву рашэнняў соймаў на ўнутры- і знешнепалітычнае жыццё дзяржавы [18]. Расійскі вучоны падрабязна даследаваў і ролю сойма ВКЛ у сферы кіраўніцтва знешняй палітыкай і дыпламатыяй дзяржавы. Па багацці сабранага матэрыялу капітальная манаграфія М. К. Любаўскага да гэтага часу не мае сабе роўных.

Акцэнт на адносіах ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай і Польшчай быў зроблены ў працы А. Я. Праснякова. Уяўляюць інтарэс яго высновы аб месцы Польшчы ва ўзаемаадносінах ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім пасля смерці польскага краля і вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча, а таксама аб становішчы праваслаўных у ВКЛ. Ён, як і М. К. Любаўскі [19, с. 191], прытрымліваўся меркавання, што ў ВКЛ не было прымусу праваслаўнага насельніцтва да перахода ў «лацінства» [23, с. 167]. Аднак адносна дадзенага пытання меркаванне М. К. Любаўскага змянілася. Гісторык ў сваім даследаванні, апублікаваным ў 1910 г., сцвярджаў, што з другой паловы XV ст. праваслаўныя ў ВКЛ цярпелі ганенні і ўціск [21, с. 200]. Навуковыя даследаванні дадзеных аўтараў абапіраліся пераважна на дакументальныя крыніцы па гісторыі ВКЛ і сталі своеасаблівай вяршыняй у развіцці расійскай (часткова беларускай) гістарыяграфіі канца XIX ст.

Такім чынам, у працах даследчыкаў XVIII ст. знешнепалітычная гісторыя Вялікага Княства Літоўскага была прадстаўлена ў агульным кантэксце развіцця гісторыі Расіі. У XIX ст. ужо абазначылася тэндэнцыя да манаграфічнага вывучэння розных аспектаў знешняй палітыкі і дыпламатыі Вялікага Княства Літоўскага. Аднак аб’ектам спецыяльнага даследавання дадзеныя пытанні так і не сталі. Расійскія гісторыкі дэманстравалі самы шырокі дыяпазон меркаванняў па разглядаемай праблематыцы, закранаючы ў сваіх даследаваннях разнастайныя яе бакі. Зроблены імі задзел стаў базай для працягу даследаванняў у наступны перыяд.

## Спіс крыніц і літаратуры

1. Антонович, В. Б. Монографии по истории Западной и Юго-Западной России / В. Б. Антонович. – Киев : Типография Е. Я. Федорова, 1885. – Т. 1. – [4]. – 351 с.

2. Бантыш-Каменский, Н. Н. Переписка между Россиею и Польшею по 1700 год, составленная по дипломатическим бумагам… / Н. Н. Бантыш-Каменский // Чтения в Обществе истории и древностей российских при Московском университете. – 1860. – Т. 4. – С. I–VIII, 1–189.

3. Батюшков, П. Н. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края / П. Н. Батюшков. – СПб. : Типография товарищества «Общественная польза», 1890. – 640 с.

4. Брянцев, П. Д. История Литовского государства с древнейших времен / П. Д. Брянцев. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1889. – 659 с.
5. Брянцев, П. Д. Очерк древней Литвы и Западной России / П. Д. Брянцев. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1891. – 150 с.
6. Грушевський, М. С. Історія України-Руси : В 7 т. / М. С. Грушевський. – Київ-Львів : друк. наук. т-ва ім. Шевченка, 1905–1936. – Т. 4 : XIV – XVI віки – відносини политични. – 1907. – 536 с.
7. Дашкевич, Н. П. Заметки по истории Литовско-Русского государства / Н. П. Дашкевич. – Киев : Типография Императорского Университета Св. Владимира, 1885. – 210 с.
8. Доброклонский, С. Краткая история российской дипломатии / С. Доброклонский. – М. : Тип. С. Селивановского, 1830. – Разд. паг.
9. Довнар-Запольский, М. В. Заметки о крымских делах в Метрике Литовской / М. В. Довнар-Запольский. – Б. м., б. д. – 13 с.
10. Довнар-Запольский, М. В. Литовские упоминки татарским ордам. Скарбовая книга Метрики Литовской 1502–1509 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Симферополь : Тип. Спиро, 1898. – 91 с.
11. Довнар-Запольский, М. В. Польско-литовская уния на сеймах до 1569 года: Исторический очерк / М. В. Довнар-Запольский. – М. : Тип. Г. Лисснера и А. Гешеля, 1897. – 28 с.
12. Иловайский, Д. И. История России : В 5 т. / Д. И. Иловайский. – М. : Тип. Грачева и К°; Типо-лит. высоч. утв. товарищества И. Н. Кушнерев и Ко; Тип. М. Г. Волчанинова, 1876–1905. – Т. 2: Московско-Литовский период, или Собиратели Руси. – 2-е изд. – 1896. – 528, 75 с.; Т. 3. Московско-царский период. Первая половина, или XVI век. – 1-е изд. – 1890. – VIII, 717 с.
13. Карамзин, Н. М. История государства Российского: Репринтное воспроизведение издания 1842–1844 гг. в трех книгах с приложением / Н. М. Карамзин. – М. : Книга, 1989. – Кн. 2. – Т. V – VIII. – 242, 228, 142, 188 стлб.
14. Карпов, Г. Ф. История борьбы Московского государства с польско-литовским. 1462–1508. Часть вторая / Г. Ф. Карпов. – М. : Университетская типография, 1867. – 164 с.
15. Ключевский, В. О. Курс русской истории / В. О. Ключевский. – СПб. : б.и., 1904. – 1146 с.
16. Коялович, М. О. Лекции по истории Западной России / М. О. Коялович. – М. : Типография Бахметева, 1864. – 394, 44 с., 1 л. табл.
17. Коялович, М. О. Чтения по истории Западной России : Прил. этногр. карта / [Соч.] Проф. М. Кояловича. Новое изд., перераб. и доп с изд. 1864 г. / М. О. Коялович. – СПб. : Типография А. С. Суворина, 1884. – XIII, [3], 349 с.; 1 л. карт.
18. Любавский, М. К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства /

М. К. Любавский. – М. : Изд-во Имп. О-ва Ист. и Древн. Рос. при Моск. ун-те, 1900. – 850, 232 с.

19. Любавский, М. К. Новый труд по внутренней истории Литовской Руси / М. К. Любавский // Журнал Министерства народного просвещения. – 1898. – Ч. 318. – № 7/8. – С. 174–215.

20. Любавский, М. К. Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута. Исторические очерки / М. К. Любавский. – М. : Университетская типография, 1892. – 884, [106] с.

21. Любавский, М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно : с прил. текста хартий, выд. Великому княжеству Лит. и его обл. / М. К. Любавский. – М. : Изд. Императ. О-ва истории и древностей рос. при Моск. ун-те, 1910. – 376 с.

22. Платонов, С. Ф. Полный курс лекций по русской истории / С. Ф. Платонов. – М. : Фирма СТД, 2005. – 830 с.

23. Пресняков, А. Е. Лекции по русской истории : в 2 т. / А. Е. Пресняков. – М. : Гос. соц.-экон. изд-во, 1938–1939. – Т. 2, вып. 1 : Западная Русь и Литовско-Русское государство. – 1939. – 245 с.

24. Соловьев, С. М. История России с древнейших времён. В 15 кн. / С. М. Соловьев. – М. : Соцэкгиз, 1960. – Кн. 2. Т. 3–4. – 781 [1] с.; Кн. 3. Т. 5.–6. – 814 [1] с.

25. Татищев, В. Н. История Российская : В 3 т. / В. Н. Татищев. – М. : ООО «Издательство АСТ»; АСТ : Ермак, 2003–2005. – Т. 1. – 2005. – 732 [4] с.; Т. 2. – 2003. – 568 [8] с.; Т. 3. – 2005. – 860 [4] с.

26. Турчинович, И. В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен / И. В. Турчинович. – СПб. : тип. Э. Праца, 1857. – XII, 303 с.

27. Устрялов, Н. Г. Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать Великое княжество Литовское? / Н. Г. Устрялов. – СПб. : Типография экспедиции заготовления государственных бумаг, 1839. – 42 с.

28. Устрялов, Н. Г. Русская история. Царствование государя императора Николая I / Н. Г. Устрялов. – СПб. : Типография А. Фридрихсона, 1855. – 446 с.

29. Щербатов, М. М. История российская от древнейших времен : в 7 т. / М. М. Щербатов. – СПб. : при Императ. Акад. наук, 1770–1791. – Т. 4, ч. 1: От начала царствования великаго князя Димитрия Иоанновича, проименованного Донской, до царствования великаго князя Иоанна Васильевича. – 1781. – 629 с.; Т. 4, ч. 2 : От начала царствования великаго князя Иоанна Васильевича, до царствования внука его царя Иоанна Васильевича, проименованного Грозный. – 1783. – [2], 542, 50 с.